# ШТРЫХІ ДА ПАРТРЭТА ПАЭТА-ЗЕМЛЯКА МІХАСЯ ПАЗНЯКОВА

**Спирин С.В.**, исследователь пед. наук, ст. преподаватель
(г. Могилев, МГУ имени А.А. Кулешова)
**Яромчик Т.Н.**, учитель белорусского языка и литературы
(г. Могилев, Учебно-педагогический комплекс ясли-сад-средняя школа № 44 г. Могилева)

Літаратура – крыніца ведаў, якая ўбірае ў сябе культуру народаў, гістарычныя факты, падарожжы. Многія людзі, прыходзячы ў бібліятэку, шукаюць творы пэўнага аўтара. Прычынай таму, хутчэй за ўсё, з'яўляецца манера пісьма ці блізкі чытачу змест твораў. А што гэта за асоба, што стварае такія творы, ад якіх не адарвацца? Што штурхае людзей да напісання твора? Чым гэты чалавек вылучаецца сярод астатніх? Раптоўна ў вас узнікае жаданне сустрэцца з аўтарам, пагаварыць пра герояў твора, задаць хвалюючыя пытанні…

Сучасныя даследчыкі імкнуцца спасцігнуць сэнс твораў, расказаць пра творцаў, скласці іх партрэт. Але наколькі праўдзівым ён будзе? Грунтуючыся амаль толькі на творах пісьменніка, нельга скласці ўсебаковы і верагодны партрэт, бо пісаць пра чалавека, якога не бачыў на ўласныя вочы, што па вадзе

віламі пісаць. Таму цэнтральнай фігурай нашага даследвання стаў Міхась Паўлавіч Пазнякоў, пісьменнік з Быхаўшчыны, вядомы грамадскі дзеяч, з якім нам давялося сустрэцца ў школе на ўрачыстай сустрэчы.

Можна вылучыць аб'ект і прадмет даследавання. Аб'ектам даследавання будзе Міхась Паўлавіч Пазнякоў. Прадметам даследавання –чалавечыя якасці (літаратурны партрэт) Міхася Пазнякова. Мэта-даследавання – выяўленне чалавечых якасцяў Міхася Паўлавіча. Тэма з'яўляецца актуальнай, бо да яе амаль не звярталіся даследчыкі. Вылучаючы асобныя рысы паэта, ніхто не даў грунтоўнай партрэтнай характарыкі, толькі ў некаторых артыкулах можна прасачыць спробы адшукаць вытокі якасцяў Пазнякова. Не так багата артыкулаў прысвечана дэталёваму разгляду творчасці, большасць крыніц расказваюць пра сустрэчы або чарговы выхад кніг аўтара.

Міхась Паўлавіч нарадзіўся ў мнагадзетнай сям'і. Ён не быў малодшым і не быў старэйшым. Гэта прывучыла яго паважаць старэйшых і клапаціцца пра малых, думаць у першую чаргу не пра сябе, а пра іншых. Будучы галоўным рэдактарам выдавецтва "Юнацтва", гаворыць: "пра сябе – пасля". У сям'і з дзяцінства выхоўвалі павагу да дзяўчат, бо яны дарылі жыццё, таму іх ніколі не крыўдзілі, не прымушалі да цяжкай працы. Міхась Пазнякоў у дзяцінстве не мог сабе дазволіць раўнадушна, спакойна гуляць у футбол, калі маці ішла па ваду з вядром. Ён прыпыняў гульню з хлопчыкамі і бег дапамагаць [10, с.105]. Ва ўспамінах паэт даволі часта выказвае захапленне нястомнай працаўніцай – маці. Заўсёды здзіўляўся, што яна здолела вырасціць 11 дзяцей, не пакрыўдзіўшы нікога. Яна не сварылася на хлопчыка нават тады, калі той растраціў 10 рублёў, якія доўга збіраліся і адкладваліся, на цукеркі, а не на кнігі [10, с.108]. Толькі вось даравацъ сабе тыя маўклівыя слёзы, што паліліся з вачэй маці, Пазнякоў так і не змог. Безумоўна, што гэты ўчынак гаворыць пра выхаванне ў ім адказнасці за свае ўчынкі, уменне адчуць гора блізкага чалавека. Не менш захапляецца Пазнякоў смеласцю маці, калі тая дапамагала партызанам [4, с. 12]. Адсутнасць страху пры добрых і справядлівых справах пазней праявіцца ў аўтара.

Не менш удзячнасці і павагі адчуваецца пры чытанні ўспамінаў пра бацьку. "Бацька ўсё ўмеў і нас прывучаў жыць са свайго мазаля і сваім розумам", [11, с. 133]. Працавітасць, самастойнасць, адданасць роднаму краю, імкненне да мірнага вырашэння праблем – вынік выхавання ў сям'і.

Вялікі ўплыў на станаўленне асобы аўтара аказала прачытаная яшчэ ў дзяцінстве кніга "Ніколі не забудзем". "Здавалася, гэта я сам выкрадаў у фашыстаў зброю, дапамагаў старэйшым у барацьбе з ворагам" [11, с. 138]. На месца спаленай суседняй вёска Студзёнка была спалена разам з 426 жыхарамі), хлопчык на месца трагедыі прыносіў кветкі.

У дзяцінстве кожны адчуваў несправядлівасць свету на сабе. Але не кожны мог адчуць несправядлівыя адносіны да іншых людзей. Міхась Паўлавіч, будучы рэдактарам школьнага "Камсамольскага пражэктара", напісаў верш у абарону сваіх настаўнікаў, якім беспадстаўна выносілі вымовы. Гэты ўчынак гаворыць пра смеласць, рашучасць, абвостранае пачуццё справядлівасці. Пазнякоў ведае: за дабро трэба плаціць дабром.

Святая справа – праца. Да працы адносіліся адказна, шчыравалі прыгожа, замілавана, настойліва. Працавалі з дзяцінства. Пасвілі кароў. За працу ў калгасе яшчэ ў 7 класе атрымаў 26 рублёў.За лета набывалі школьныя рэчы, абутак, кнігі [11, с. 136]. Вось як праяўляецца спагада да блізкіх, якім цяжка было гадаваць дзяцей, вось вытокі ініцыятыўнасці, самастойнасці.

Міхась Пазнякоў добра памятае, як бацька прывучаў павазе да кожнага дрэва, як да жывой істоты. Захацеўшы паспытаць кляновага соку, падсек клён, але той сцякаў па ствале. Бацька замазаў раны дрэва, а хлопчыка прывязаў да дрэва, каб падзяліў з ім пакуты. У апавяданні "Клён" аўтар не прыводзіць свайго пакарання. Дзеці самі добра разумеюць дрэнны ўчынак. Неаднаразова сваю еднасць з прыродай падкрэслівае ў твора "зноўку з выраю вярнуся" [12, с. 33].

Такім чынам, яшчэ з дзяцінства Міхась Пазнякоў засвоіў павагу да старэйшых, маці, жанчын, умеў шчыра захапляцца навакольным асяродзем і ахоўваць яго, сям'я прывіла яму працавітасць, адказнасць за свае ўчынкі, спагадлівасць, дабрыню, самастойнасць, шчырасць. Паэт добра засвоіў, што ён – гэта частка прыроды, што жывое, як і чалавек, здольна перажываць.

Якім павінен быць сучасны пісьменнік, на творах якога выхоўваецца сённяшняе пакаленне? Звернемся да крыніц, дзе даследчыкі характарызуюць асобу Міхася Паўлавіча Пазнякова.

"Міхась Пазнякоў – знешне гэта спакойны, ураўнаважаны чалавек, не помню, каб ён выйшаў з сябе, крыкнуў, закамандаваў ці пакрыўдзіў каго" [10, с. 41]. Сваё меркаванне выказвае і пісьменнік: "Крытыкаваць, разумна спрачацца, уносіць прапановы. Але не ганьбіць!" [9, с. 5].

Хочацца адзначыць таксама адчуванні ад нашай сустрэчы з М. Пазняковым. Інтэлегентны, спакойны, ураўнаважаны, сціплы, добры, шчодры, разумны, спагадлівы, удзячны, ён любіць усё рабіць сам, не перакладаючы на іншых самую нязначную справу.

Бацьку ўсе ведалі як майстра на ўсе рукі, вясёлага, заядлага танцора, вострага на язык і ў той жа час сціплага, спагадлівага. Гэтыя якасці і перадаліся сыну ў поўнай меры [5, с. 5]. І сапраўды "востры", Пазнякоў нават псеўданім спецыяльны сабе абраў – Чмель, ды і на пасаду рэдактара сатырычна-гумарычнага часопіса "Вожык" не ўсіх бяруць.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Акадэмік Уладзімір Гніламёдаў характарызаваў Міхася Пазнякова як чалавека з нястомнай, пастаянна працуючай душой, маючы на ўвазе яго рознабаковую творчую дзейнасць і кіруючыя пасады [3, с. 3]. Ён лічыць, што Міхась Пазнякоў цэніць шчырасць, праўдзівасць, сапраўднасць пачуцця [2, с. 3]. "Я ніколі не быў кар'ерыстам, хаця ўсё жыццё – на адказных пасадах. Люблю працаваць з усёй душой, настойліва, спакойна, адказна. Але не люблю тузання і не цярплю бяздушных, абыякавых да людзей хітруноў з двайным "дном", заскарузлых чынуш" [9, с. 5].Уменне трымаць руку на пульсе часу, рэальна ацэньваць свае магчымасці і здольнасці праяўляюцца ў словах: "Калі адчую, што стаміўся і "прабуксоўваю" – напішу заяву аб "адсаўцы" [9, с. 5].

Аналізуючы творчасць М. Пазнякова, даследчыца Масляніцына вылучыла добрыя арганізатарскія здольнасці, называе пісьменніка ўмелым прапагандыстам [8, с. 24]. "Кіраўнік павінен быць тактоўным, чулым, уважлівым, сумленным, а ўжо затым патрабавальным" [9, с. 5].

Пісьменнік шчыра спачувае дзецям, якія не маюць нармальнай сям'і, таму і прымае Валодзьку як роднага сына (апавяданне "Сынок"), хоча прыцягнуць увагу грамадства да праблем сіроцтва (верш "Сірата").

Безумоўна, Міхасю Паўлавічу было ў каго вучыцца і вучыўся ён на выдатна. З павагай ставячыся да спагадлівых, смелых, гасцінных, стрыманых, разважлівых, чыстых, клапатлівых, адкрытых людзей, ён з лёгкасцю пераняў гэтыя якасці.

Паэзія – гэта душа, настрой аўтара. У ёй праяўляецца той вобраз, які пісьменнік хоча бачыць. Верш напаўняецца пачуццямі аўтара. Якія ж яны, вершы Міхася Паўлавіча? Без электрычнасці, адкрытыя, спакойныя, далікатныя, зычлівыя, якія закранаюць душу шчырасцю, непасрэднасцю, спавядальнасцю інтанацый [1, с. 21]. Героі твораў многіх дзіцячых твораў з'яўляюцца ў меру паслухмяныя, у меру гарэзлівыя дзеці, у душах якіх, пры належным выхаванні, заўсёды знойдзецца месца спагадзе, шчырасці.

У сваіх творах, на думку Кашубы, аўтар вучыць мудрасці, сяброўству чалавечай спагадзе, любові да прыроды, апавяданні садзейнічаюць выхаванню міласэрнасці, узаемадапамогі, любові да працы [4, с. 12]. Марціновіч лічыць, што казкі спрыяюць выхаванню высакароднасці, здольнасці суперажываць [7, с. 10]. Адным словам, усяму таму, чаму навучыла жыццё М. Пазнякова і чаго, што так не хапае сёння.

Паэт прасейвае праз сэрца кожную сустрэчу, кнігу, чалавека, пакідаючы сабе толькі станоўчае. Такім чынам, асабістыя якасці былі закладзены ў маленстве. Вялікі ўплыў на станаўленне паэта аказалі банька, маці, якія выхоўвалі ўласным прыкладам і жыццёвай мудрасцю, аднавяскоўцы, наваколле, настаўнікі. Перад намі паўстаў руплівы, адказны, працавіты, шчыры, шчодры, добразычлівы, уважлівы, сціплы, сумленны, выхаваны, стрыманы, чулы, клапатлівы, патрабавальны, разумны, дапытлівы, уражлівы, аддаы, спакойны, далікатны, адкрыты, праўдзівы, добры, самастойны, сучасны, сапраўдны, непасрэдны, кемлівы, цікавы, справядлівы чалавек.

У даследаванні вылучаны найбольш характэрныя рысы пісьменніка, якія праявіліся пад час гутаркі з ім, выказваліся даследчыкамі пры аналізе твораў ці асабістых сустрэчах, значная колькасць праявілася праз паэзію. Рысы, якія вылучаліся рознымі спосабамі і браліся з розных крыніц, не супярэчылі адна другой, а суадносіліся, паўтараліся, даказваючы еднасць асобы, у якой слова не разыходзіцца са справай.

Асабістыя якасці былі закладзены ў маленстве. Вялікі ўплыў на станаўленне паэта аказалі бацька, маці, якія выхоўвалі ўласным прыкладам і жыццёвай мудрасцю, аднавяскоўцы, наваколле, настаўнікі.

Творчасць аўтара цалкам супадае з жыццёвай пазіцыяй пісьменніка, творы выхоўваюць ў чытача запатрабаваныя часам рысы, лірычны герой імкнецца прынесці як мага больш карысці, быць прыкладам, дарадцам.

Анкета, прапанаваная вучням 4–6, 10 класаў, утрымлівала пытанне "Хто такі М. Пазнякоў?". У рабоце знойдзена больш за 20 слоў, якія б можна было аднесці да аб'екта даследавання: кіраўнік, паэт, настаўнік, рэдактар, пісьменнік, гумарыст, сатырык, перакладчык, мовазнаўца, крытык, сем'янін, патрыёт, грамадзянін, наватар, арганізатар, гуманіст, псіхолаг, аптыміст, прапагандыст, вучоны, дарадчык, выхавацель, байкапісец…Але на пытанне журналістаў, хто ж такі Міхась Пазнякоў, творца сур'ёзна адказаў: "Настаўнік". Усё сваё жыццё паэт уласным прыкладам выхоўвае дзяцей і тых, хто знаходзіцца побач. Ён імкнецца сваёй творчасцю пасеяць зерне спагады, шчодрасці, любові да людзей і навакольнага асяроддзя, спрабуе растапіць сэрца закамянелых няверцаў, нагадаць людзям пра сумленне і добрыя справы.

Такім чынам, вырашаючы задачы, мы дабіліся пастаўленай намі мэты –выявілі чалавечыя якасці Міхася Паўлавіча Пазнякова. Вынікі нашага даследвання можна выкарыстаць пры аналізе твораў Пазнякова, пры наладжванні сусрэчы, на ўроках беларускай літаратуры, на факультатыўных занятках, на пазакласных мерапрыемствах.

Спіс цытаваных крыніц:

1. Гніламёдаў, У. Прырода, Радзіма, жыццё…// Роднае слова. – 2013. – №1. – С. 21–23.
2. Гніламёдаў, У. З любоўю і шчыра // М. Пазнякоў Залаты ключык духоўнасці. – Мінск: Чатыры чвэрці, 2010. – С. 3–5

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3. Кавалёў, В. Дарыць святло і цеплыню // ЛіМ. – 2008. – 14 лістапада. – С. 3.
4. Кашуба, І. Скарбонка дабрыні // ЛіМ. – 2013. – 21 чэрвеня. – С. 12.
5. Коласаў, М. З любоўю да роднага краю // Маяк Прыдняпроўя. – 2004. – 30 красавіка. – С. 5.
6. Леўчанка, М. За ўсё баліць яго душа // Маяк Прыдняпроўя. – 1993. – 26 мая. – С. 3.
7. Марціновіч, А. Пазначана дабрынёй // ЛіМ. – 2013. –24 мая. – С. 10.
8. Масляніцына, І. Спалучаць талент з адказнасцю // ЛіМ. – 2011. –14 красавіка. – С. 24.
9. Мінчукова, А. Абуджаць у чалавеку Чалавека // ЛіМ. – 19 снежня. – С. 5
10. Міхась Пазнякоў: "Тварыце людзі на зямлі дабро…": артыкулы, рэцэнзіі, выступленні, інтэв'ю / укл. Т.М. Дубаневіч. – Мінск: Чатыры чвэрці, 2011. – 272с.
11. Пазнякоў, М. І роднай вёсцы пакланюся // Маладосць. – 2006. – № 6. – С. 132–138.
12. Пазнякоў, М.П. Святое правіла…: вершы, пароды, байкі, эпіграмы / М.Пазнякоў. – Мінск: Маст. літ., 2008 г. – 270 с.

Архив библиотеки МГУ имени